**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за чэрвень 2023 г.

## Мерапрыемствы да Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны

**20 чэрвеня**
**22 чэрвеня**

Гісторыка-літаратурны час «Той первой ночью, в ранний час рассвета…», прымеркаваны да Дня міру ў рамках рэспубліканскага Тыдня моладзі «Moladz.by: ценим мир, создаем будущее!», арганізаваны для навучэнцаў Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа. Дзеці пазнаёміліся з трагічнай гісторыяй спаленых вёсак на Кобрыншчыне, з партызанскім рухам на тэрыторыі Беларусі, з пісьменнікамі-франтавікамі, пачулі гісторыі пра дзяцей у фашысцкіх канцлагерах. Мерапрыемства суправаджалася праглядам відэапрэзентацыі «Мінулых гадоў святая памяць» і музычнымі нумарамі вакальнай групы «Фантазія». Удзельнікі мерапрыемства пазнаёміліся з выставай-экспазіцыяй «Праз кнігу - да міру і стварэння».

ЦБ, 28 чал., 26 чал.

**21 чэрвеня**

Да Дня стварэння ў рамках рэспубліканскага Тыдня моладзі «Moladz.by: ценим мир, создаем будущее!» прайшоў патрыятычны час «Памятники Великой Победы». Выхаванцы лагера працы і адпачынку УА «Сярэдняя школа № 6 г. Кобрына» даведаліся, што ў розных кутках нашай краіны ў памяць аб страшных падзеях Вялікай Айчыннай вайны створаны мемарыяльныя комплексы і манументы, якія ўваходзяць у ваенна-гістарычныя маршруты і экскурсіі.

ЦРБ, 22 чал.

**21 чэрвеня**

У бібліятэцы прайшоў урок мужнасці «А завтра была война» для дзяцей з летняга аздараўленчага лагера. Бібліятэкар расказала дзецям пра першыя дні Вялікай Айчыннай вайны, пра абаронцаў Брэсцкай крэпасці, пра аднавяскоўцаў, якія пайшлі бараніць Радзіму. Ушанавалі памяць загінуўшых землякоў і ўсклалі кветкі ў помніка.

Філіял «Дзівінская публічная бібліятэка», 39 чал.

**22 чэрвеня**

Бібліятэка арганізавала квэст-гульню «Дорогами войны». Падчас квэста ўдзельнікі прайшлі станцыі: «Этих дней не смолкнет слава», «Техника ВОв», «Города-герои», «Медсанбат», «Мы помним», «Песни войны». Каманды-пераможцы ўзнагароджаны граматамі. Дэгуставалі салдацкую кашу. У помнікаў вёскі Тэўлі ўдзельнікі ўсклалі кветкі, ушанавалі памяць загінулых хвілінай маўчання.

Тэвельская ПБ, 31 чал.

**22 чэрвеня**

На гадзіну гістарычнай памяці «Давайте, люди, никогда об этом не забудем» бібліятэка запрасіла дзяцей з лагера працы і адпачынку. Бібліятэкар

прадэманстравала ролікі пра першыя гадзіны Вялікай Айчыннай вайны, відэапрэзентацыю «Помнить, чтобы жизнь продолжалась», агляд літаратуры «Вайна і дзеці». Падзяліўшыся на дзве каманды, прысутныя прайшлі туры: «Трагическое начало», «Города-герои», «Творчество в годы Великой Отечественной войны», «Великие люди», «Вечная им память!».

Гарадзецкая ПБ, 18 чал.

**<u>Мерапрыемствы да Міжнароднага дня аховы дзяцей</u>**
**<u>Мерапрыемствы ў рамках раённага конкурсу на лепшую пастаноўку работы з дзецьмі і падлеткамі ў канікулярны час у рамках сацыя-культурнага праекта «Объединить, заинтересовать, увлечь»</u>**

**1 чэрвеня**

У рамках конкурсна-забаўляльнай праграмы «Мы с друзьями не скучаем, а играем и читаем» для дзяцей дзіцячага садка № 16 праведзена экскурсія па бібліятэцы «Мы сегодня в книжный дом на экскурсию идём», віктарына «Знатоки сказок», у пакоі казак паказаны лялечны спектакль «Жадная ежиха».

Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 21 чал.

**2 чэрвеня**

Падчас правядзення гістарычнага экскурсу «Дети войны, вы детства не знали» вучні УА «Сярэдняя школа № 9 г. Кобрына» прагледзелі электронную прэзентацыю «В их детство ворвалась война», адказалі на пытанні пазнавальнай віктарыны «У времени есть своя память». Прадстаўлена прэзентацыя кніжнай выставы «И были вместе: дети и война».

Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 57 чал.

**4 чэрвеня**

Супрацоўнікі філіяла «Дзіцячая бібліятэка» прынялі ўдзел у святе гульні і цацкі ў ТАА «Палессе». Бібліятэкары прапанавалі дзецям гульні, конкурсы, віктарыны. Праведзена бяспройгрышная латарэя. Усе ўдзельнікі дзіцячай пляцоўкі атрымалі прызы. Увагай юных удзельнікаў свята карысталася выстава «Книжная радуга детства».

Філіял «Дзіцячая бібліятэка»

**13, 14, 15 чэрвеня**

У рамках гадзіны вясёлых задум «Живет на всей планете народ весёлый - дети» для навучэнцаў школы № 6 праведзены экскурсія «В гости к книгам» і тэатралізаваная віктарына «Если книжки ты читаешь, вмиг героев угадаешь». У чытальнай зале іх увагу прыцягнула бібліяасарці «Волшебный лес журнальных чудес».

Філіял «Дзіцячая бібліятэка» 138 чал.

**14 чэрвеня**

Бібліятэкар правяла квэст-гульню «Какого цвета лето». Каманды, атрымаўшы заданні, павінны былі прайсці па станцыях: «Дерево», «Сыпучее место», «Лето красное», «32», «Конфеты». Дзеці гулялі, адгадвалі загадкі, знаёміліся з кніжнымі выставамі і адказвалі на пытанні. Кожны ўдзельнік атрымаў салодкі прыз.

Гарадзецкая ПБ, 24 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**1 чэрвеня**

У бібліятэцы прайшла цырымонія ўзнагароджання пераможцаў адкрытага рэгіянальнага літаратурнага конкурсу «Во имя мира». У ліку пераможцаў - члены літаратурнага клуба «ПоэтиКо» кобрынскай бібліятэкі. Гэта Зінаіда Навасад (1 месца ў намінацыі «Паэзія») і Марына Міхалюк (адмысловы дыплом «За захаванне памяці пакаленняў» у намінацыі «Паэзія»). Святочны настрой стварала вакальная група бібліятэкараў «Фантазія».

*(Кондрашук, Н. Литераторы во имя мира / Наталья Кондрашук // Заря. – 2023. – 17 чэрвеня (№ 47). – С. 16).*

ЦРБ, 16 чал.

**2 чэрвеня**

У рамках сумеснага праекта Публічнага цэнтра прававой інфармацыі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі і натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна «Библиотека и нотариат: взаимовыгодное сотрудничество» ў ПЦПІ адбыліся індывідуальныя кансультацыі натарыусаў. Жадаючым была прадстаўлена магчымасць у ходзе асабістых зносін з натарыусамі натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна Ірынай Пятроўнай Марчук, Наталляй Расціславаўнай Магуйло атрымаць адказы на пытанні.

ЦРБ, 14 чал.

**6 чэрвеня**

Для удзельнікаў клуба «Залаты ўзрост» Кобрынскага ТЦСАН прайшла літаратурная вечарына «И божество, и вдохновенье, и жизнь, и слёзы, и любовь…», прысвечаная 225-годдзю з дня нараджэння рускага паэта, драматурга і празаіка А. С. Пушкіна. Вядучыя расказалі пра жыццё і творчасць паэта, госці прачыталі свае любімыя творы. Аформлена выстава «Вновь я открываю пушкинский томик».

ЦРБ, 28 чал.

**7 чэрвеня**

Арганізавана гадзіна грамадзянскасці і патрыятызму «Ведаем, паважаем, ганарымся» для выхаванцаў лагера працы і адпачынку УА «Сярэдняя школа № 6 г. Кобрына». Супрацоўнікі бібліятэкі прапанавалі ўдзельнікам пазнавальны відэаролік аб дзяржаўных сімвалах нашай краіны «Сімвалы дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь», інтэрактыўную інтэлектуальную гульню «Дзяржаўная сімволіка маёй краіны», краязнаўчую віктарыну «Сімволіка малой радзімы», экскурс у ПЦПІ бібліятэкі. Старэйшы памочнік пракурора Кобрынскага раёна Марына Мікалаеўна Рало правяла гутарку «Дзяржаўныя сімвалы пад абаронай закона».

ЦРБ, 23 чал.

**17 чэрвеня**

У бібліятэцы прайшоў Дзень прафесійнага камунікавання «Совместная деятельность клубных и библиотечных учреждений по организации досуга детей и подростков, региональный опыт и перспективы развития», удзельнікамі якога сталі клубныя і бібліятэчныя работнікі раёна. Адкрыла мерапрыемства начальнік аддзела культуры В. В. Пакалюк. На праблемныя пытанні адказалі спецыялісты ДУ «Центр по обеспечению деятельности бюджетных организаций». Метадыстамі аддзела бібліятэчнага маркетынгу былі асветлены пытанні «Методическое сопровождение деятельности публичных библиотек района по организации работы с детьми и

подростками» і «Социокультурные проекты публичных библиотек с детской аудиторией: разработка и воплощение».

ЦРБ, 50 чал.

**21 чэрвеня**

Пасяджэнне літаратурнага клуба «ПоэтиКо» ў Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшло ў фармаце літаратурнай лабараторыі «Тропы». Кіраўнік клуба, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Наталля Кондрашук прэзентавала сваю новую кнігу для дзяцей «Переводчик», ілюстрацыі да якой зрабіла таленавітая маладая мастачка Ангеліна Марчук.

ЦРБ, 12 чал.

**23 чэрвеня**

Арганізавана пазнавальная гадзіна «Спорт в жизни великих», прымеркаваная да Дня спорту ў рамках рэспубліканскага Тыдня моладзі «Moladz.by: ценим мир, создаем будущее!». Выхаванцы лагера працы і адпачынку СШ № 8 г. Кобрына і падапечныя Кобрынскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната здзейснілі займальнае падарожжа ў свет літаратуры і спорту, прагледзелі відэаролік «Спортивный досуг писателей», прынялі ўдзел ў віктарыне «О спорт! Ты воспитатель поколений».

ЦРБ, 19 чал.

**25 чэрвеня**

Карыстальнікі бібліятэкі запрошаны на гумарыстычны спектакль «Вся власть пенсионерам» тэатра-студыі «Пирожок».

ЦРБ, 36 чал.

**25 чэрвеня**

Да дня моладзі ў рамках рэспубліканскага Тыдня моладзі «Moladz.by: ценим мир, создаем будущее!» у парку супрацоўнікамі бібліятэкі арганізавана станцыя «Літаратурная» квэст-гульні «Родной город».

ЦРБ, 35 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 3 85 81